Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 3. Варыянт 3**

## Білет №3. Практычнае заданне. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь

**Заданні склала:** Нікіценка Наталля Іванаўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства
ДУА «Сярэдняя школа №13 г.Жлобіна імя В.В.Гузава»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**
Пытанні і заданні 1. На якіх прынцыпах будуецца знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь?
2. Якім чынам геаграфічнае становішча ўплывае на характар знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь?
3.Дакажыце важнасць для Рэспублікі Беларусь удзелу ў дзейнасці ЕАЭС.
4. Вызначыце, у чым заключаюцца перспектывы ўдзелу Рэспублікі Беларусь у ЕАЭС.

**I.**Еўразійскі эканамічны саюз




**II. Экспарт тавараў з Беларусі ў 2018 г.**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**III. З перадвыбарнай праграмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі ў 2001 г.**

*«…Беларусь – у цэнтры Еўропы, і яна будзе жыць у адзінай Еўропе, у міры і згодзе з усімі суседзямі. Знешняя палітыка беларускай дзяржавы будзе заснавана на прынцыпах шматвектарнасці і захавання норм міжнароднага права. Саюзныя адносіны з брацкай Расіяй - асноўны прыярытэт знешнепалітычнай дзейнасці кіраўніцтва Беларусі. Мы будзем будаваць самыя трывалыя адносіны з нашымі суседзямі і краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Адначасова мы адкрыты для ўсебаковага і раўнапраўнага супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі свету. …будаваць свае адносіны з усімі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі мы будзем толькі зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў, на аснове роўнасці і ўзаемнай павагі».*

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

**1.** Знешняя палітыка беларускай дзяржавы заснавана на прынцыпах шматвектарнасці і захавання норм міжнароднага права.

**2.** У знешняй палітыцы Рэспубліка Беларусь, знаходзячыся ў транзітным становішчы паміж Еўропай і Расіяй, будуе добрасуседскія адносіны з навакольнымі краінамі. Такое геаграфічнае становішча абумовіла шматвектарны характар знешняй палітыкі: інтэграванне з Расіяй, партнёрства з СНД і Еўрасаюзам, прасоўванне экспартных і інвестыцыйных інтарэсаў у краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі

**3**. Пасля распаду СССР узнік разрыў эканамічных сувязей паміж былымі рэспублікамі Савецкага Саюза. Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі з краінамі Еўрасаюза і іншых развітых дзяржаў свету, узнікла ідэя ажыццявіць новы саюз цяпер ужо суверэнных дзяржаў. Спачатку быў створаны Мытны саюз паміж Расіяй, Казахстанам і Беларусь, пазней да яго далучыліся Кыргызстан і Арменія. У 2015 годзе быў створаны Еўразійскі эканамічны саюз. У ЕАЭС - Еўразійскі эканамічны саюз уваходзяць Беларусь, Расія, Арменія, Казахстан, Кыргызстан.
Ён створаны для ўсебаковай мадэрнізацыі і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальных эканомік дзяржаў - членаў ЕАЭС. Удзел у ёй дае магчымасць Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляць узаемавыгаднае супрацоўніцтва з удзельнікамі саюза: ажыццяўляць гандаль і кааперацыю ў прамысловым развіцці.

**4.** ЕАЭС - гэта міжнародная арганізацыя, прызначана для фарміравання адзінай эканамічнай прасторы паміж краінамі - удзельніцамі: забеспячэнне свабоды руху тавараў, а таксама паслуг, капіталу і рабочай сілы, і правядзенне скаардынаванай, узгодненай або адзінай палітыкі ў галінах эканомікі. Удзел у ёй дае магчымасць і ў будучым Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляць узаемавыгаднае супрацоўніцтва з удзельнікамі саюза, што дасць магчымасць эканамічнае ўзаемадзеянне перавесці на новы ўзровень.